# Ля вытокаў мемарыялізацыі падзей вайны 1812 года на беларускіх землях стаяў наш зямляк

Напярэдадні 209-х угодкаў Бярэзінскай аперацыі вайны 1812 года хацелася б распавесці аб персоне, па ініцыятыве і клопатамі якой у Віцебску на 100-гадовы юбілей ваеннай кампаніі быў збудаваны манументальны абеліск "Героям Айчыннай вайны 1812 года". Падобны помнік планавалася ўсталяваць у Барысаве, пра што "Гоман" пісаў неаднаразова. Не многім вядома, што прадстаўнічыя камісіі ў абодвух гарадах па збудаванні абеліскаў узначальваў выхадзец з Зембіна Усевалад Антонавіч Кадыгробаў (5.05.1877-1920?). Лёс адпусціў нашаму земляку ўсяго 43 гады. Аднак зрабіў ён гэтулькі ўсяго карыснага, што іншым і некалькі жыццяў не хопіць.

Грамадскую дзейнасць і заслугі патомнага дваранiна Кадыгробава яшчэ пры жыцці высока ацанілі сучаснікі, а з прысваеннем прыдворнага звання камер-юнкера імя Усевалада Антонавіча публікавалася ў "Прыдворных календарах". Увайсці ў аўтарытэтнае штогадовае выданне было высокім гонарам для персоны, якая пражывала на прасторах Расійскай імперыі. Не забыты Кадыгробаў і нашымі сучаснікамі. Біяграфічныя звесткі аб ім утрымлівае том трэці "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (1996), даведнік "Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г. (2006) і іншыя выданні. Дастаткова звестак у інтэрнэт-прасторы.

…Прафесійнае і грамадскае жыццё гэтай выдатнай асобы ўмоўна дзеліцца на Казанскі, Віленскі, Віцебскі, Гарадзенскі і Пецярбургска-петраградскі перыяды (аб менскім і барысаўскім этапах пазней).

Казанскаму ўласціва атрыманне выдатнай адукацыі (дыплом 3-й Казанскай гімназіі з залатым медалём (1895) і дыплом 1-й ступені юрыдычнага факультэта Казанскага ўніверсітэта (1899). Віленскаму – пачатак кар'еры юрыста (кандыдат на судовыя пасады, памагаты сакратара, сакратар 1-а крымінальнага дэпартамента Віленскай судовай палаты). Віцебскаму і Гарадзенскаму – узыходжанне па службовых лесвіцах (таварыш (намеснік) пракурора Віцебскага акруговага суда (1905-1911),пракурор Гарадзенскага акруговага суда (1911-1912, 1913-1915). Пецярбургска/петраградскаму – пік прафесійнай кар'еры (намеснік пракурора Петраградскай судовай палаты (1913, 1915-1917). Абранне ад Менскай губерні ў дэпутаты IV Дзяржаўнай Думы Расійскай імперыі – вяршыня грамадскай дзейнасці Усевалада Антонавіча, нягледзячы на тое, што ў снежні 1912-а (праз два месяцы пасля абрання) ён адмовіўся ад дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Наш зямляк вылучаўся на прафесійнай, грамадскай, гісторыка-краязнаўчай і вучэбна-адукацыйнай ніве. Выкладаў заканазнаўства ў мужчынскай і Марыінскай жаночай гімназіях Віцебска. У сааўтарстве выдаў падручнік "Заканазнаўства" (1909) для сярэдніх навучальных устаноў, актыўна публікаваўся. Даследаваў старажытнасці, помнікі архітэктуры ў Віцебскай губерні. Уваходзіў у рэдакцыйны камітэт па выданні зборнікаў "Полацка-Віцебская даўніна". Адзін з заснавальнікаў і старшыня Віцебскай навуковай архіўнай камісіі, якая аб'ядноўвала гісторыкаў і краязнаўцаў. Па ініцыятыве і на сродкі камісіі былі адкрыты настаўніцкі інстытут (1910) і аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (1911).З пераездам у Гародню сумяшчаў службовыя абавязкі з плённай педагагічнай і краязнаўчай працай, з'яўляўся старшынёй Гарадзенскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта. Абіраўся галосным (дэпутатам) Барысаўскага паветовага і Менскага губернскага земскіх збораў, выступіў ініцыятарам заснавання ў Менску вышэйшай навучальнай установы. Спіс дасягненняў і ініцыятыў Усевалада Антонавіча на гэтым не заканчваецца. Падрабязней спынімся на мемарыяльнай дзейнасці падзей вайны 1812 года.


Помнік у Віцебску, які прысвечаны падзеям 1812 г.

Кадыгробаў, відавочна, даўно выношваў планы па ўстаноўцы помнікаў на беларускіх палях бітваў, а менавіта ў Віцебску, Ваўкавыску і Барысаве. Напярэдадні юбілея ініцыятыва пачала станавіцца рэальнасцю. Калі ў кастрычніку 1910 года Віцебская гарадская ўправа і Віцебская навуковая архіўная камісія прыйшлі да дамовы, была сфармавана "Злучаная камісія па збудаванні ў г. Віцебску помніка Айчыннай вайны 1812 г.".Старшынёй камісіі абралі Усевалада Антонавіча.

На паседжанні Віцебскага губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі, які адбыўся 18 (5) лютага 1911 года, камісія хадайнічала аб асігнаванні сродкаў. "Калі кожны з нас імкнецца паставіць помнік або хаця б крыж на магіле кожнага са сваіх блізкіх, – пераконваў прысутных на паседжанні Усевалад Антонавіч, – то няўжо ж мы, хаця б цяпер, праз сто гадоў, не паставім агульныя высілкамі помніка тым тысячам герояў, пра каторых мы нават не ведаем, дзе яны пахаваныя". Па даручэнні камісіі Санкт-Пецярбургскае таварыства архітэктараў абвясціла конкурс праектаў. Галоўнае патрабаванне – помнік "не павінен быць складаней канструкцыі, але просты і прыгожы".16 (3) траўня на агульным зборы з 14 прадстаўленых праектаў была абрана праца вядомага расійскага архітэктара, выкладчыка пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Івана Фаміна. Спраектаваны архітэктарам абеліск, выкананы ў лепшых традыцыях рускага класіцызму XVIII – пачатку XIX стагоддзяў, адпавядаў усім пажаданням заказчыка. Папярэдні каштарыс помніка склаў 15 000 рублёў. У пошуках сродкаў камісія арганізоўвала дабрачынныя акцыі, звярталася ў розныя інстанцыі, персанальна да прадстаўнікоў грамадскасці, да камандавання палкоў – правапераемнікаў воінскіх злучэнняў, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях у Віцебску.

Па прапанове Фаміна быў зроблены драўляны макет помніка і ўсталяваны на абраным месцы. Адразу выявіліся недахопы, і архітэктар адкарэктаваў праект, які ў працэсе дапрацоўваўся. У прыватнасці, 26-мятровая чатырохгранная гранітная стэла, якая складаецца з 11 блокаў, стала танчэйшай. Двухгаловы арол, які сядзіць на шары, вянчаў помнік, хоць першапачаткова пік быў вострым. Пастамент упрыгожыла цэнтральная чыгунная памятная дошка з надпісам: "Несмяротнай доблесці герояў Айчыннай вайны – удзельнікаў бітвы пад г. Віцебскам 13, 14 і 15 ліпеня і 26 кастрычніка 1812 года" і дзве бакавыя бронзавыя дошкі. Пазней ля помніка ўсталявалі не прадугледжаныя праектам чатыры марціры, адлітыя па ўзорах артылерыйскіх гармат часоў цара Пятра I. Устаноўку помніка прыйшлося перанесці да Дваровай плошчы, у сувязі з чым Кадыгробаў прапанаваў перайменаваць яе ў Аляксандраўскі бульвар. Цырымонія закладкі помніка адбылася 8 лістапада (26 кастрычніка) 1911 года.І зноў месца прызналі няўдалым. Нарэшце, віцебскія думцы ў траўні 1912-а пастанавілі збудаваць помнік насупраць губернатарскага палаца, дзе ў 1812-м правеў два тыдні Напалеон перад наступленнем на Смаленск.


Усевалад Кадыгробаў.

Кошт помніка тым часам узрос у два разы. Адпушчаных і сабраных сродкаў катастрафічна не хапала, і тады было вырашана каштарыс істотна ўрэзаць, што аўтаматычна пацягнула б памяншэнне і спрашчэнне помніка, больш за сціплае добраўпарадкаванне тэрыторыі. Хоць да юбілейных мерапрыемстваў заставаліся лічаныя месяцы, Усевалад Антонавіч вырашае звярнуцца да прэм'ер-міністра Пятра Сталыпіна. З гэтым выбітным дзяржаўным дзеячом Расійскай імперыі наш зямляк сустракаўся ў лістападзе 1910 года. Тады аўдыенцыя прайшла вельмі вынікова: Сталыпін падтрымаў устаноўку помніка ў гонар 100-годдзя вайны 1812 года. Падчас другой сустрэчы прэм'ер-міністр паабяцаў дапамагчы з грашыма. Акрамя таго, выказаў гатоўнасць падтрымліваць іншыя ініцыятывы Усевалада Кадыгробава, дазволіўшы ў выпадку асобай неабходнасці звяртацца наўпрост.

Вылучаных дзяржавай 18 600 рублёў з лішкам хапіла на манумент і добраўпарадкаванне. Урачыстае адкрыццё помніка адбылося 19 (6) снежня 1912 года, у дзень тэзаімянін імператара Мікалая II. Велічны абеліск, размешчаны ў гарадскім скверы герояў Айчыннай вайны 1812 года і сёння славутасць Віцебска.

***(Працяг будзе)***

***Аляксандр Балябін,***
***гісторык-археограф ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева"***